# СПРАВА

ВЫПУСК 4

Беларуска-ўкраінскі
АЛЬМАНАХ
Таварыства ўкраінскай літаратуры
пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў

●

Білорусько-український
АЛЬМАНАХ
Товариства української літератури
при Спілці білоруських письменників

Мінск
«Белпрынт»
«Смэлтак»
2017

# Змест / Зміст


БЕЛ **Паўліна Скурко**. Боль і як з ім жыць — тэма нумару . . . . . . . . . . . 5

**ЮБІЛЕЙ / ЮВІЛЕЙ**

БЕЛ **Віктар Кахновіч**. Прафесар М.С. Грушэўскі — выбітны гісторык і грамадскі дзеяч. Яго бачанне гістарычных лёсаў украінскага і беларускага народаў . . . . . . . . . . . 8

БЕЛ **Ірына Дубянецкая**. Некаранаваны кароль Украіны . . . . . . . . . . . 24

**POLSKI AKCENT**

БЕЛ **Лешак Шарэпка**. Беларусы не гусі . . . . . . . . . . . 32

РУС **Игнаций Карпович**. Сонька . . . . . . . . . . . 39

**ПРОЗА**

БЕЛ **Алесь Кіркевіч**. Самурай . . . . . . . . . . . 112

УКР **Олесь Поплавський**. Час не належить мені . . . . . . . . . . . 121

РУС БЕЛ **Таня Скарынкина**. Цёця Яня, Арнольд С. і Сяргей Параджанаў . . . . . . . . . . . 124

**ПАЭЗІЯ / ПОЕЗІЯ**

УКР **Олександр Грицай**. Дума про Небесну сотню і Майдан . . . . . . . 135

БЕЛ **Уладзімір Шыпіла**. Вершы . . . . . . . . . . . 151

БЕЛ **Вольга Шпакевіч**. Вершы . . . . . . . . . . . 153

БЕЛ **Наталля Сацута**. Вершы . . . . . . . . . . . 155

**ПЕРАКЛАДЫ / ПЕРЕКЛАДИ**

БЕЛ УКР **Сяржук Сыс**. Вершы, пераклады . . . . . . . . . . . 158

**ГАВОРКІ — НАШ СКАРБ**

Бр.г. **Вера Філосаф** . . . . . . . . . . . 164

Бр.г. **Пэтро Шэпетюк** . . . . . . . . . . . 166

Бр.г. **Ніна Амяльчук** . . . . . . . . . . . 167

**ІСТОРІЯ**

УКР **Ярослав Антонюк**. Як в 1956 році загинув керівник останньої боївки ОУН на теренах Берестейщини . . . . . . . . . . . 169

**ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА**

УКР **В'ячеслав Левицький**. Як зробити «старэйшых» і «Маладняк» однаково модними: Олександр Сорока — перекладач із білоруської літератури . . . . . . . . . . . 181

БЕЛ **Вячаслаў Рагойша**. Іван Дзенісюк, беларусалюб і беларусазнаўца . . . . . . . . . . . 194


---

БЕЛ беларуская мова  Бр.г. брэсцка-пінскія гаворкі
УКР українська мова  РУС русский язык

**КАНГРЭС**

БЕЛ Таварыства ўкраінскай літаратуры на VI Кангрэсе даследчыкаў Беларусі . . . . . . 201

**ПАМЯЦЬ**

БЕЛ **Зінаіда Дудзюк**. Дойлід (успаміны пра А.Д. Кудзіненку) . . . . . . . 205

**АГРАСЯДЗІБА**

БЕЛ Бр.г. **Ала Палікарпук**. «Муховэцька кумора» . . . . . . .211

**ПАСМІХНЕМСЯ**

БЕЛ **Васіль Грынь**. Замалёўкі . . . . . . . 214

**КАРЦІНА З ВОКЛАДКІ**

БЕЛ **Алесь Мара (Аляксей Марачкін)**. Ціхая ўкраінская ноч . . . . . . 223


---

**Як чытаць па-ўкраінску**

Літары ўкраінскага алфавіту ідэнтычныя літарам беларускага алфавіта.
Адрозніваюцца толькі 5 літар:
літара «и» чытаецца як беларускае «ы»,
літара «ї» чытаецца як «йі»,
літара «є» чытаецца як «е»,
літара «е» чытаецца як «э»,
літара «ґ» чытаецца як «г» у рускай мове (выбухны гук).

# *В*іктар *К*ахновіч

БЕЛ



Беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДУ. Жыве ў Мінску. Нарадзіўся у 1983 г. у вёсцы Церабень Пінскага раёна.


## Прафесар М.С. Грушэўскі — выбітны гісторык і грамадскі дзеяч. Яго бачанне гістарычных лёсаў украінскага і беларускага народаў

У верасні 2016 г. адзначаўся слаўны 150-гадовы юбілей са дня нараджэння выдатнага гісторыка, прафесара, акадэміка, грамадскага дзеяча, публіцыста і пісьменніка Міхаіла Сяргеевіча Грушэўскага. Яго значэнне ў справе вывучэння мінулага ўкраінскага народа, барацьбе за годнае і суверэннае развіццё ўкраінскай нацыі, у разбудове ўкраінскай акадэмічнай навукі — выключнае. З 2002 г. па 2016 г. у львоўскім выдавецтве «Світ» выйшла 46 тамоў збору прац выдатнага ўкраінскага гісторыка, плануецца выданне 50 тамоў, што ўключаюць шматлікія дадаткі і рэцэнзіі на яго творы. У 150-ю гадавіну праводзіліся ўрачыстыя кніжныя выставы ў Нацыянальных бібліятэках Украіны і Беларусі і іншых бібліятэках свету, 29 верасня 2016 г. са спецыяльным зваротам да ўкраінскага народа з нагоды юбілею М.С. Грушэўскага звяртаўся Прэзідэнт Украіны П.А. Парашэнка, у кастрычніку і лістападзе 2016 г. ва ўніверсітэтах Кіева і Львова праводзіліся міжнародныя навуковыя канферэнцыі ў гонар Грушэўскага, 29 верасня 2016 г. была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар Грушэўскага ў Палтаве[1]. Імя выбітнага гісторыка зберагаецца ў шэрагу музеяў, у назвах мноства вуліц і

[1] Е-архів Михайла Грушевського: Mykhailo Hrushevsky's Digital Archives [Electronical resource]. — 2016. — Національна бібліотека України імені В.І. Вернадського. — Режім доступу: http://hrushevsky.nbuv.gov.ua/cgi-bin/hrushevsky/person.exe?I21DBN=ELIB...; Да 150-годдзя Міхаіла Грушэўскага [Electronical resource]. — 2016. — Нацыянальная бібліятэка Беларусі. — Рэжым доступу: http://www.nlb.by/portal/page/portal/index/ detailed_news?param0=149375&lang=ru&rubricId=424.



«Завдяки історичній пам’яті людина стає особистістю, народ — нацією, країна — державою».

«...Суспільність, що має віру в себе, мусить мати і відвагу глянути на неприкрашену правду свого минулого, щоб зачерпнути в ній не зневіру, а силу».

«Поки рідна мова не здобуде місця у вищій школі, поки вона не служить органом викладання в університетських та інших навчальних закладах, поки вона не стала знаряддям наукової праці у викладанні і літературі, доти суспільство, народність, що розмовляє цією мовою, почуватиме себе на становищі нижчої, «культурно-неповноцінної нації».

*Михайло Грушевський.*

плошчаў; створаны сайт — энцыклапедыя жыцця і творчасці М.С. Грушэўскага[2].

Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі нарадзіўся 29 (17) верасня 1866 г. у гарадку Холм, што ў сярэдзіне XIII ст. быў сталіцай Галіцка-Валынскай дзяржавы ці Каралеўства Русі (Украіны). Бацька Міхаіла Сяргеевіча, выкладчык уніяцкай гімназіі і жаночага вучылішча ў Холме, Сяргей Фёдаравіч Грушэўскі (1830—1901) быў ураджэнцам Чыгірыншчыны, выпускніком Кіеўскай духоўнай акадэміі, прафесарам, выдатным знаўцам славянскіх моў і літаратуры, аўтарам лепшага падручніка па царкоўна-славянскай мове для школ часоў Расійскай імперыі. Абставіны вымушалі сям’ю Грушэўскіх пераязджаць з месца на месца, а ў 1869 г., праз стан здароўя бацькі, — пераехаць у Грузію. Сяргей Фёдаравіч займаўся этнаграфічнымі і гістарычнымі даследаваннямі, выпісваў «Кіеўскую старыну» і прывіў сваім дзецям любоў да ўкраінскай мовы і народа. Напрыклад, ва ўспамінах 1927 г. М.С. Грушэўскі згадваў, што бацька яго дбаў аб тым, каб «скріпити й поглибити в мені пієтизм до рідного краю, його природної красоти, етнографічних особливостей, мови, пісні, поезії. Не бувши активним українцем в теперішнім розумінні, але визначаючись поетичним почуттям, він відчував живо красу українського життя і традиції, і передав се мені»[3].

Маці Міхаіла Сяргеевіча Глафіра Захар’еўна (?—1918) была з роду украінскіх грэка-каталіцкіх святароў Апуцкевічаў. Дарэчы будзе сказаць, што малодшыя брат Міхаіла Аляксандр (1877—1942) і сястра Ганна (1880—1943) таксама былі выдатнымі ўкраінскімі гісторыкамі. Варта заўважыць, што маці Міхаіла загінула ад траўм пасля спалення дому Грушэўскіх у Кіеве ў студзені 1918 г.[4], а брат і сястра сталі ахвярамі рэпрэсій сталінізму-імперыялізму.



[2] Михайло Грушевській: енциклопедія життя і творчості [Electronical resource]. — 2016. —Рэжым доступу: http://www.m-hrushevsky.name.

[3] Грушевський, Михайло. Як я був колись белетристом? // Михайло Грушевський: енциклопедія життя і творчості [Electronical resource]. — 2016. — Рэжым доступу: http://www.m-hrushevsky.name/uk/Memoirs/JakJaKolysBuvBeletrystom.html.

[4] Грушевський, М.С. Автобіографія (1926) [Electronical resource]. — 2012. — Рэжым доступу: http://chtyvo.org.ua/authors/Hrushevskyi/Avtobiohrafiia_1926. (с. 81, спасылка 4 у арыгінале выдання тэксту, у т.л. сведчанні Яўгеніі Крычэўскай).

Міхаіл Грушэўскі скончыў Тыфліскую (Тбіліскую) гімназію (1880—1886), пасля чаго паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта, дзе навучаўся ў 1886—1890 гг. Цікава, што ў 1885—1886 гг. адбыўся пералом у жыццёвых планах маладога Грушэўскага. У свае гімназічныя гады ён захапляўся літаратурнай працай, і ў 1885 г. у Львове ў часопісе «Діло» было надрукавана яго апавяданне «Бех-аль-Джугур», прысвечанае змаганню суданцаў на чале з прарокам Махдзі супраць каланізатараў. Апошняе сімвалічна ў тым сэнсе, што сваё жыццё юнак збіраўся прысвяціць вызваленню ўкраінскага народа ад расійскага імперскага прыгнёту. Аднак пошук сюжэтаў для твораў, наўмысная перагрузка студэнтаў класічнай філалогіяй ва ўніверсітэце (маўляў, тады не будзе часу і думкі да рознае «шатасці»), глыбокая ўнутранная цяга, — скіравалі яго ў бок гісторыі[5]. Навуковым кіраўніком маладога гісторыка стаў Уладзімір Баніфацьевіч Антановіч (1834—1908), выдатны ўкраінскі гісторык, этнограф і археограф, адзін з заснавальнікаў арганізацыі ўкраінскіх дэмакратаў (1897). Антановіч займаўся зборам і выданнем крыніц па гісторыі Украіны. Цікава, што пазней клопат аб выданні гістарычных крыніц захапіў і Грушэўскага.

Вялікую ўвагу гісторыкі школы Антановіча надавалі гісторыі асобных рэгіёнаў і народных масаў. Дарэчы, Міхаіл Сяргеевіч працягваў традыцыі ўкраінскага нарадоўства XIX ст. (Кірыла-Мяфодзьеўскае таварыства і яго ідэйныя нашчадкі сярод украінскай інтэлегенцыі, у т.л. «хлапаманы», такія як У.Б. Антановіч). У сваім артыкуле 1917 г. М.С. Грушэўскі пісаў, што Кірыла-Мяфодзьеўскае брацтва 1846 г. аб’яднала ў свой час выдатных украінцаў: «…огнені строфи Шевченка, натхненні поклики Костомарова, (…) мови різних молодих братчиків, особливо з селянства, взагалі з демократичних низів», — сталі сапраўдным пачаткам і падмуркам адроджанай новай Украіны. Грушэўскі так апісваў выключнае гістарычнае значэнне яго папярэднікаў: «Те, що дала російській революції й визволенню народів Росії українська політична мисль, іде від їх сміливих протестів проти царського деспотизму, проти бюрократичного самовластя, проти всіх обмежень старого режиму, проти панування маючих і владущих верств і визиску ними робочих мас, проти поневолення селянства, проти темноти і безправ’я, в яких перебували демократичні верстви народу»[6].

Пра Уладзіміра Баніфацьевіча Антановіча, свайго настаўніка, у 1909 г. Грушэўскі напісаў артыкул, дзе падкрэсліваў думку, што «кірыла-мяфодзьеўскі» погляд на гісторыю ўкраінскага народу быў успрыняты Антановічам, прычым таму давялося прайсці разрыў з архаічным саслоўным светабачаннем польскага шляхецкага асяродку, з якога ён паходзіў[7]. Зной-

[5] Там жа.

[6] Грушевський, М.С. В сімдесяті роковини Кирило-методіївської справи. (1917) [Electronical resource]. — 2012. — Рэжым доступу: http://chtyvo.org.ua/authors/Hrushevskyi/V_simdesiati_rokovyny_Kyrylo-metodiivskoi_spravy. (Літературно-Науковий Вістник. Т. 67, кн. 1. 1917. С. 8—13).

[7] Грушевський, М.С. Володимир Антонович, основні ідеї його творчості і діяльности (1909) [Electronical resource]. — 2012. — Рэжым доступу: http://chtyvo.org.ua/authors/Hrushevskyi/Volodymyr_Antonovych_osnovni_idei_ioho_tvorchosti_i_diialnosty. (с. 198 у арыгінале артыкулу 1909 г.).

дзем тут і словы, якімі можна акрэсліць жыццёвае крэда не толькі Антановіча, але і самаго Грушэўскага: «І в основі всієї пізнішої його наукової творчости заляг цей глибокий пієтизм, тепла і сердечна любов до цього (українского) народу. Він обожав в нім його суцільність, стихійну гармонію, високу красу побуту і глибоку природню льоґічність мислі; хилив чого перед його високими культурними і соціяльними інстинктами, високо гуманною вдачею і тонким етичним почуттям, гарячою жагою і непохитним бажанням справедливости»[8].

З вышэйсказанага зразумела, чаму Міхаіл Сяргеевіч быў у першую чаргу даследчыкам гісторыі ўкраінскага народу, сялянства і мяшчан, сацыяльных працэсаў і культуры. Заўважым, што такі погляд вынікаў як справядлівы водгук на гістарычную сітуацыю ў саслоўна-манархічных рэжымах у Расійскай і Аўстра-Венгерскай імперыях, што тады падзялялі паміж сабой украінскі народ (і шэраг іншых славянскіх і неславянскіх народаў). Асабліва балючай была сітуацыя ва ўмовах расійскага самадзяржаўя: тут, у адрозненні ад Аўстра-Венгрыі, да 1905 г. не было нават права гаварыць і пісаць па-ўкраінску, годна вызнаваць адрозную ад афіцыйнага расійскага праваслаўя веру, а да таго ж — не было элементарных грамадзянскіх правоў. Зразумела, чаму М.С. Грушэўскі, як і вялікае мноства прадстаўнікоў інтэлегенцыі яго часу, трымаўся сацыялістычных поглядаў. Так, у 1917—1924 гг. ён супрацоўнічаў з украінскімі сацыялдэмакратамі і эсэрамі на Радзіме і ў эміграцыі.

Па завяршэнні ўніверсітэта М.С. Грушэўскі падрыхтаваў і абараніў у 1894 г. магістарскую дысертацыю аб гісторыі Барскага старасства. Трэба сказаць, што даследчая праца Грушэўскага была смелай, бо неабходна было пераадолець шмат цяжкасцей: сабраць і апрацаваць першакрыніцы на розных мовах па неразгледжанай у навуцы тэме, асэнсаваць і данесці да калег вялікую колькасць сведчанняў, фактаў, назіранняў і высноў. Але Міхаіл Сяргеевіч выдатна справіўся з выклікам і паказаў сябе як выдатны навуковец. У тыя часы магістарская ступень адпавядала сучаснаму паняццю кандыдата гістарычных навук і давала права выкладаць ва ўніверсітэтах. Па закліку Антановіча ў якасці маладога прафесара гісторыі М.С. Грушэўскі накіраваўся ў Львоў. Тут аўстрыйскія ўлады пагадзіліся з аргументамі ўкраінскай інтэлегенцыі і абвесцілі аб адкрыцці першай у Еўропе кафедры ўкраінскай гісторыі. З аднога боку, тое была выдатная падзея для ўкраінскага народу, але з іншага — патрабаваліся вялізарныя высілкі, каб разгарнуць у Львове шырокія даследаванні гісторыі і культуры ўкраінцаў, напісаць лекцыі і падручнікі па ўкраінскай гісторыі. Напэўна, Антановіч меў рацыю: агромністая задача была па сілах хіба для такой маладой, таленавітай, эрудыраванай і руплівай, дасціпнай і творчай асобы як Міхаіл Сяргеевіч.

З кастрычніка 1894 г. па восень 1914 г. М.С. Грушэўскі жыў і працаваў у Львове і на Галічыне. У красавіку 1894 г. замест абяцанай кафедры украінскай гісторыі аўстрыйскія ўлады стварылі ўсяго толькі кафедру сусветнай

[8] Там жа. (с. 197).

гісторыі са спецыяльным аглядам гісторыі Усходняй Еўропы[9]. Тым не меней, Грушэўскі быў запрошаны да працы ў якасці прафесара, і львоўскія гады жыцця сталі для навукоўца надзвычай плённымі. Тут ён адразу далучыўся да працы Літаратурнага таварыства імя Т. Шаўчэнкі (заснавана ў 1873 г.). З 1890 г. дзейнасць Шаўчэнкаўскага таварыства выйшла далёка за межы ўласна літаратурнай работы, яно вяло даследаванні, займалася шырокай асветніцкую дзейнасць, — і таму з 1892 г. было пераўтворана ў Навуковае таварыства імя Тараса Шаўчэнкі (НТШ). Па сваім характары яно пераўтварылася ў міжнародную навуковую супольнасць і стала своеасаблівай Усеўкраінскай Акадэміяй навук, накшталт лепшых еўрапейскіх. Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі далучыўся да НТШ яшчэ ў 1893 г., а ў 1897—1913 гг. быў старшынёй Таварыства. З 1895 г. па 1913 г. ён рэдагаваў «Записки Наукового товариства імені Шевченка». Тое была вельмі цяжкая і складаная праца; вядома, што выйшла 113 тамоў Запісак НТШ пад яго рэдакцыяй. Тым не менш, Грушэўскі плённа займаўся навуковымі пошукамі, арганізаваў работу Археаграфічнай камісіі НТШ па зборы, апрацоўцы і выданні гістарычных, этнаграфічных, мовазнаўчых, літаратурных першакрыніц. Так, пры яго ўдзеле выйшлі «Жерела до історії України-Русі», «Пам’яткі української історії та літератури», з 1906 г. выходзіў «Україно-руський архів». У 1895 г. у Львове выйшаў 1-ы том галоўнай яго гістарычнай працы «Історія України-Русі». Усяго на працягу 1895—1936 гг. у Кіеве і Львове выйшла 10 тамоў «Історії України-Русі», што стала першай вялікай абагульняльнай працай па гісторыі ўкраінскага народу да сярэдзіны XVII ст. Апроч таго, сумесна з Іванам Якаўлевічам Франко (1856—1916) Грушэўскі ў 1898 г. заснаваў і выдаваў «Літературно-науковий вістник» НТШ, а ў 1899 г. заснаваў Украінскую выдаўнічую суполку. Можна сказаць, што ў эпоху Грушэўскага НТШ ператварылася ў сапраўдную Украінскую Акадэмію. З яго вучняў паўстала бліскучая школа ўкраінскіх гісторыкаў, сярод якіх былі такія славутыя імёны як Іван Крып’якевіч (1886—1967), Іван Джыджора (1880—1919), Мірон Кардуба (1876—1947), Сцяпан Тамашыўскі (1875—1930) і інш.

Вядома, што ў львоўскія гады Міхаіл Сяргеевіч быў актыўным членам украінскай грамады Галічыны. Так, у 1899 г. ён сумесна з Іванам Франком быў сярод арганізатараў Украінскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі, што патрабавала дэмакратызацыі грамадскага і палітычнага жыцця ў Галічыне. Справа ў тым, што тады ў краі адчувалася засілле палякаў, якія мелі магутную патрымку сярод буйных землеўласнікаў рэгіёна, пераважна палякаў, і гэта дазваляла ім дамінаваць у палітычнай і культурнай сферы Галічыны, нягледзячы нават на адносную падтрымку ўкраінцаў з боку аўстра-венгерскай манархіі. Відаць, рэаліі тагачаснага супрацьстаяння ў Галіцыі глыбока ўразілі Міхаіла Сяргеевіча і сфармавалі ў яго збольшага негатыўнае бачанне польскасці. Так, у аўтабіяграфіі Грушэўскі заўважыў:

[9] Грушевський, М.С. Автобіографія (1926) [Electronical resource]. — 2012. — Рэжым доступу: http://chtyvo.org.ua/authors/Hrushevskyi/Avtobiohrafiia_1926. (с. 86—87).



**Грушэўскі і Франко сярод удзельнікаў з'езду ўкраінскіх пісьменнікаў у Львове, 1898 г.**

«...поляки нічим не хочуть поступатися в своїм пануванню й не розуміють інших відносин до русинів (українців), як відносини пануючої народності до служебної»[10]. У прынцыпе, такі погляд ёсць скразным для яго гістарычных прац. Заўважым, што ён вельмі добра накладаецца на сацыялістычныя прыхільнасці Грушэўскага і гістарычны вопыт украінскага народа часоў прыгоннага права і Хмяльніччыны. Цікава, што адначасна яму даводзілася абараняцца ад нападак з боку расійскіх шавіністаў, якія дакаралі Грушэўскага за прыхільнасць да украінскага народніцтва (а цікавасць да ўсяго украінскага шэльмавалі як «сепаратызм»), а таксама з-за яго «Очерка истории украинского народа», што выйшаў у Пецярбургу ў 1904 г. і стаў першым аглядам гісторыі ўкраінцаў з даўнейшых часоў да пачатку XX ст. Варта заўважыць, што шавінізм быў уласцівы расіянам не толькі з рэтраградскіх, чарнасоценных колаў, але нават мноству людзей ліберальных поглядаў. І з асаблівай нянавісцю накідваліся шавіністы на М.С. Грушэўскага з-за яго прагнення аўтаноміі для Украіны. У той жа час ён ніколі не быў ворагам Расіі і расіян[11].

З часам перад Міхаілам Сяргеевічам ясна паўстала думка, што неабходна дбаць аб з'яданні галіцкай і наддняпранскай частак украінскага народа, пашыраць асвету сярод украінцаў, спрыяць іх культурнаму развіццю. Пэўныя надзеі на пазітыўныя перамены прынесла рэвалюцыя 1905—1907 гг. у Расійскай імперыі. Пад ціскам народных мас расійскі рэжым пайшоў на абвяшчэнне элементарных грамадзянскіх свабод (Маніфест 17 кастрычніка 1905 г.), правоў веравызнання (указ 17 красавіка 1905 г.), была фармальна

[10] Там жа. С. 72.
[11] Там жа. С. 73, 79, 81, 86.

знятая забарона на выкарыстанне ўкраінскай мовы ў друку і навучанні. Гэта натхніла М.С. Грушэўскага арганізаваць археаграфічныя экспедыцыі ў Кіеў, Харкаў, Маскву, Пецярбург, Варшаву і іншыя гарады. З 1906 г. ён дбаў аб пераносе дзейнасці НТШ са Львова ў Кіеў. Напрыклад, у Кіеў было перанесена выданне «Літературно-наукового вістника»; з таго часу навуковыя і публіцыстычныя работы Міхаіла Сяргеевіча пераважна выходзілі у Кіеве ці Пецярбургу. Увесну 1907 г. па ініцыятыве Грушэўскага было заснавана Украінскае навуковае таварыства ў Кіеве.

Аднак перадавыя перамены ў абставінах расійскай рэчаіснасці аказаліся нетрывалымі, і ўжо вельмі хутка рэакцыянеры-шавіністы разгарнулі наступ на дэмакратычныя здабыткі 1905—1907 гг. Напачатку меры самадзяржаўя былі стрыманымі. Так, у 1908 г. па ўказцы ўладаў Грушэўскі не змог быць прыняты як прафесар у Кіеўскі універсітэт. Ва ўспамінах ён прама адзначаў, што расійскія чыноўнікі забаранялі яму прыезд на тэрыторыю Расійскай імперыі[12]. І гэта пры тым, што рэвалюцыянерам Грушэўскі тады не быў, і належаў да кола «украінскіх паступоўцаў» (1908 г.), што патрабавалі ўсяго толькі аўтаноміі Украіны і парламенту, а метады «паступоўцаў» былі выключна легальнымі і мірнымі. Варта заўважыць, што калі падчас Першай сусветнай вайны Львоў пэўны час знаходзіўся пад расійскай акупацыяй (верасень 1914 г. — чэрвень 1915 г.), то расіяне разграмілі друкарню, панішчылі кніжныя, рукапісныя і музейныя зборы НТШ, а саму дзейнасць украінскіх навукоўцаў забаранілі. Між тым, поўны добрых спадзяванняў Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі ў лістападзе 1914 г. вярнуўся ў Кіеў, дзе жыла тады яго сям'я, сябры і калегі. І першае, што з ім сталася тады ў Кіеве — арышт і высылка ў Сімбірск па абвінавачванні ў шпіянажы на карысць Аўстра-Венгрыі. Цікава, што абвінавачванне тое было бездоказнае, а сам наказ аб арышце Грушэўскага быў выдадзены расійскім жандарскім упраўленнем загадзя, яшчэ 30 жніўня 1914 г. Трэба сказаць, што ў Сімбірску Міхаіл Сяргеевіч не затрымаўся, бо шэраг прыхільных да яго расійскіх вучоных (А.А. Шахматаў, С.Ф. Альдэнбург і інш.) хадайнічалі перад уладамі аб змякчэнні для прафесара ўмоў высылкі. Таму ў верасні 1915 г. М.С. Грушэўскі з сям'ёй (жонка Марыя-Івана і дачка Кацярына) змог пераехаць у Казань, а затым у верасні 1916 г. у Маскву[13]. Тут вучоны мог заняцца навуковай працай, хаця і заставаўся пад пільным наглядам паліцыі.

Радыкальныя перамены ў лёсе вучонага, а таксама ўкраінскага і іншых паняволеных народаў Расійскай імперыі прынесла Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Ужо 4 (17) сакавіка 1917 г. у Кіеве па ініцыятыве шэрагу ўкраінскіх грамадскіх аб'яднанняў, партый і прафсаюзаў узнікла Украінская Цэнтральная Рада (УЦР) — прадстаўнічы орган украінскага народа. Пасля таго як у красавіку 1917 г. адбыўся Агульнаўкраінскі нацыянальны кангрэс, Украінская Цэнтральная Рада была пашырана і фактычна ператварылася ў орган найвышэйшага даверанага прадстаўніцтва ўкраінскага народа. Яшчэ 7 (20)

[12] Там жа. С. 77.

[13] Там жа. С. 85—86.

сакавіка Міхаіл Сяргеевіч завочна быў абраны галавой (прэзідэнтам) УЦР. На гэтай пасадзе як глава ўкраінскага парламента ён знаходзіўся да 29 красавіка 1918 г. Па вяртанні ў Кіеў 14 (27) сакавіка 1917 г. М.С. Грушэўскі актыўна уключыўся ў палітычнае жыццё і падтрымаў платформу ўкраінскіх эсэраў. Напачатку моцным было яго спадзяванне на пабудову раўнапраўнага федэратыўнага саюзу з абноўленай Расіяй. Аднак перамовы, што пачала УЦР з расійскім Часовым урадам з мая 1917 г., зайшлі ў тупік. Выявілася, што Часовы ўрад не хацеў вызнаваць правы ўкраінцаў на самабытнасць і самастойнасць. У гэтым праявілася ранейшае масавае атручанне расіян вялікадзяржаўным шавінізмам. Прадстаўнікі Часовага ўраду ў Пецярбурге ў сваёй большасці нават не былі гатовы паабацяцаць украінцам нацыянальна-тэратырыяльную аўтаномію ў перспектыве. Таму з апорай на падтрымку шырокіх колаў народа УЦР у сваім Першым універсале 10 (23) чэрвеня 1917 г. абвесціла аўтаномію Украіны і ўзяла на сябе адказнасць за жыццё краіны. У выніку праз 2 тыдні расійскаму Часоваму ўраду давялося ў асобах кіраўніка А.Ф. Керанскага і 2-х упаўнаважаных дэлегатаў накіравацца ў Кіеў і прызнаць права ўкраінскага, а разам з тым і ўсіх народаў былой Расійскай імперыі, на самавызначэнне, вызнаць фактычную дзяржаўную аўтаномію Украіны. Аднак калі 3 (16) ліпеня 1917 г. УЦР абвесціла Другі Універсал, дзе згодна з дамовай з Часовым урадам абвесціла УЦР органам найвышэйшай улады на тэрыторыі Украіны, гэта адразу ж выклікала вострыўрадавы крызіс у расійскай сталіцы. Паказальна і кідаецца ў вочы, што на знак нязгоды 3 міністры Часовага ўраду (кадэты ці нібыта лібералы) падалі ў адстаўку, а сярод рэшты толькі 2 з 10 аказаліся на справе гатовымі падтрымаць права Украіны на аўтаномію[14]. Тады ж стала зразумела, што адзінай магчамасцю рэалізацыі гістарычных і аб'ектыўных правоў украінскага народу ёсць выключна дзяржаўны суверынітэт Украіны. Да такой думкі паступова прыйшоў і Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі. Пасля пачатку подлай расійскай савецкай экспансіі ва Украіну (мяжа 1917/1918 гг.) непазбежнай стала рэалізацыя суверэнітэту Украінскай Народнай Рэспублікі, што ўрачыста і быў абвешчаны 22 студзеня 1918 г. Згадваюцца пры тым словы ўкраінскага гімна: «Згинуть наші воріженьки, як роса на сонці, запануєм і ми, браття, у своїй сторонці».

Звяртае ўвагу, што толькі 4 (17) верасня 1917 г. расійскі Часовы ўрад нарэшце вызнаў Генеральны Сакратарыят (выканаўчы орган УЦР) найвышэйшай дзяржаўнай уладай ва Украіне. Між тым, энтузіязм украінскіх мас бурліў. Яшчэ ў чэрвені на Усеўкраінскім сялянскім З'ездзе па ініцыятыве ўкраінскіх эсэраў сяляне-украінцы запатрабавалі самастойнага вырашэння зямельных пытанняў, бо былі ўкрай расчараваныя празмерным зацягваннем вырашэння гэтых пытаняў з боку расійскага Часова ўраду і З'езду Саветаў. Затым у ліпені 1917 г. на II Усеўкраінскім вайсковым з'ездзе дэлегаты ад усіх украінскіх вайскоўцаў у межах колішняй Расійскай імперыі запатра-

[14] Шестаков, В.А. Новейшая история России с начала XX в. и до сегодняшнего дня. — М.: АСТ, Астрель, 2008. С. 53.



**На вайсковым парадзе ў Кіеве зімой 1917 г.**

бавалі неадкладнай рэалізацыі права ўкраінскага народа на ўласную дзяржаву. Тады ж прыхільнікі Украінскага дэмакратычна-хлебаробскага саюзу (сяляне і памешчыкі, інтэлігенты, збольшага з Палтаўшчыны і Кацярынаслаўшчыны, якія арыентаваліся на нацыянальную згоду і прыватную гаспадарку ды руплівую працу) рашуча выказаліся ў падтрымку поўнага суверэнітэту Украіны. Тады ж шырока разгарнулася фарміраванне ўкраінскай нацыянальнай арміі, сеткі органаў украінскай улады на месцах.

7 лістапада (25 кастрычніка) 1917 г. УЦР выдала III Унівесал, дзе абвяшчала Украінскую Народную Рэспубліку у межах пражывання ўкраінскага народу, праграму сацыяльных рэформ, курс на выхад Украіны з вайны. Сведчаннем шырокай падрымкі УЦР на чале з М.С. Грушэўскім былі вынікі выбараў 12 (25) лістапада 1917 г. ва Устаноўчы сход зямель колішняй Расійскай імперыі, дзе партыя украінскіх эсэраў атрымала звыш 63 % галасоў ва Украіне[15]. Бальшавіцкі ж урад у Петраградзе, з аднога боку, дэкляраваў прызнанне дзяржаўнага суверынітэту УНР (4 (17) снежня 1917 г.), але з другога — у снежні 1917 г. бальшавікі спрабавалі паваліць УЦР. Аднак гэтыя планы праваліліся: паўстанне бальшавікоў-рабочых у Кіеве і Адэсе не знайшло падтрымкі і былі падаўлена. Тады ж у снежні 1917 г. на I Усеўкраінскім З’ездзе Саветаў у Кіеве УНР атрымала ізноў шырокую народную падтрымку. Характэрна, што пасля гэтага 7 студзеня 1918 г. (25 снежня 1917 г.) бальшавікі-імперыялісты пачалі вайну з Украінай і право-

[15] Выборы во Всероссийское учредительное собрание, 1917. [Electronical resource]. — 2006. — Рэжым доступу: http://www.electoralgeography.com/ru/countries/r/russia/1917-uchreditelnoe-sobranie-russia.html.

дзілі інтэрвенцыю пад выглядам марыянеткавай «Савецкай УНР», а таксама разгарнулі шырокую падрыўную прапаганду, каб справакаваць безлад і разбой[16].

Як і іншыя кіраўнікі Украінскай рэспублікі, М.С. Грушэўскі апынуўся ў складанай сітуацыі: УНР выйсці з Першай сусветнай вайны яшчэ не паспела, а ўкраінскае войска знаходзілася ў стадыі фарміравання. Неабходна была знешняя дапамога, і яе змагла прапанаваць Германія. Дэлегацыя УНР далучылася да мірных перагавораў у Брэсце, прычым Савецкая Расія, што таксама вяла перамовы аб міры з Германіяй і яе саюзнікамі, запатрабавала непрызнання УНР. У чарговы раз намеры расіян праваліліся, і 27 студзеня 1918 г. УНР падпісала мірнае пагадненне ў Брэсце. Гэтым міжнародным актам Украіна была прызнана суверэннай дзяржавай ў этнічных межах, а таксама УНР гарантавалася ваенная дапамога ў змаганні з бальшавіцкай экспансіяй. Пасля салідарнага адпору, 3 сакавіка 1918 г., савецкая Расія мусіла поўнасцю прызнаць правы, межы і паўнамоцтвы УНР. Між тым, толькі ў выніку паходу Запарожскай дывізіі арміі УНР у красавіку 1918 г. Крым быў у асноўным вызвалены ад бальшавікоў і далучаны да УНР, а 29 красавіка 1918 г. Чарнаморскі флот вывесіў украінскія сцягі і перайшоў пад юрысдыкцыю Украіны. Яшчэ 20 лютага 1918 г. абвешчаная кубанскімі казакамі (нашчадкамі казакоў-запарожцаў) Кубанскай Народная Рэспубліка далучылася да УНР; пасля 22 студзеня 1919 г. з УНР з'ядналася Заходне-Украінская Народная Рэспубліка. Агулам 1918 год быў трыумфам Украіны.

Разам з тым, войскі Германіі і Аўстра-Венгрыі як саюзнікі ўступілі на тэрыторыю Украіны, але нямецкае ваеннае камандаванне часта не праяўляла належнай салідарнасці з украіцамі. Асабліва раздражнялі нямецкіх генералаў сацыялічныя погляды кіраўнікоў УНР і галавы УЦР М.С. Грушэўскага. У выніку сімпатыі кансерватыўнага германскага генералітэта схіліліся ў бок хлебаробскага руху і памешчыкаў-украінафілаў, што бачылі магчымасці Украіны ў стварэнні Украінскай Дзяржавы на чале з манархам-гетманам. Як вынік, 29 красавіка 1918 г. пры падтрымцы нямецкай арміі адбыўся пераварот. УЦР і Генеральны Сакратарыят былі распушчаныя, замест УНР была абвешчана Гетманская Дзяржава. Гетманам стаў адстаўны камандзір 1-га ўкраінскага корпуса генерал П.П. Скарападскі. У той жа дзень УЦР зацвердзіла Канстытуцыю УНР, дзе краіна абвяшчалася парламецкай рэспублікай. Вядома, што Канстытуцыю распрацавала камісія на чале з М.С. Грушэўскім. Пасля гетманскага перавароту Грушэўскі нелегальна прыжываў у розных месцах Кіева, знаходзіўся ў апазіцыі да гетмана Скарападскага.

З аглядам на гістарычную сітуацыю трэба сказаць, што арыентаваная толькі на інтарэсы памешчыкаў палітыка Скарападскага (пры многіх станоўчых дасягненнях) выклікала незадаволенне сялянаў, і на гэтай хвалі ізноў расла папулярнасць УНР. Між тым, пасля пачатку рэвалюцый у Гер-

[16] Фактычна, гэта была сепаратысцкая рэспубліка, створаная бальшавікамі — дэлегатамі саветаў рабочых з гарадоў усходняй Украіны (Харкаў і Данбас). Большая частка з іх была расіянамі, што апынуліся ў меншасці падчас І Усеукраінскага З'езду Саветаў.

маніі і Аўстра-Венгрыі (кастрычнік 1918 г.) савецкая Расія (як і расіяне з Белага руху) зноў пачалі экспансію ва Украіну. Апошняй паспрыяў сам гетман Павел Скарападскі, што 14 лістапада 1918 г. выступіў з маніфестам на карысць федэратыўнага саюзу з Расіяй, бо спадзяваўся так атрымаць падтрымку ў барацьбе з бальшавікамі ад краін Антанты і расійскіх белагвардзейцаў. Гэта быў фактычна акт дзяржаўнай здрады, што выклікаў масавае абурэнне і рэвалюцыю ў краіне. Была адноўлена Украінская Народная Рэспубліка на чале з урадам — Дырэкторыяй. Вядучыя пазіцыі ў Дырэкторыі занялі прадстаўнікі найбольш папулярных у тагачаснай Украіне ўкраінскіх сацыялістычных партый. У той час як украінцы змагаліся паміж сабой (Скарападскі адмовіўся ад сваіх гетманскіх паўнамоцтваў толькі 14 снежня 1918 г.), бальшавікі-расіяне разгарнулі чарговую экспансію. У снежні 1918 г. занялі шэраг раёнаў Чарнігаўшчыны. Экспансія з усходу вымусіла сілы УНР і гетманату з'яднацца, але тое адбылося запозна. Савецкая Расія атрымала колькасную і аператыўную перавагу, хаця украінцы аказвалі ворагу адчайнае супраціўленне. У студзені 1918 г. расіяне акупавалі Левабярэжжа, а 8 лютага 1919 г. захапілі Кіеў[17].

Вядучыя краіны Еўропы і ЗША былі занятыя мірнымі перагаворамі ў Парыжы і паваенным уладкаваннем Еўропы і свету, і агрэсія расіян супраць Украіны засталася без адказу. Відаць, М.С. Грушэўскага, як і многіх украінцаў тады, гэта расчаравала; з сакавіка 1919 г. Міхаіл Сяргеевіч знаходзіўся ў эміграцыі. На працягу 1919—1924 гг. ён змяніў шэраг месцаў пражывання на чужыне: Прага, Парыж, Жэнева, Берлін, Вена. У Вене ім быў заснаваны ў 1919 г. Украінскі сацыялагічны інстытут (з 1924 г. інстытут пераехаў у Прагу). Да 1922 г. Міхаіл Сяргеевіч браў актыўны удзел у працы II Інтэрнацыянала, але пасля супярэчак сярод украінскіх сацыялістаў пажадаў засяродзіцца выключна на навуковай працы. Тады ён працаваў над шматтомнай «Історіэю української літератури» і выдаў з 1923 г. 5 тамоў гэтай працы (6-ты заставаўся ў рукапісах і быў выдадзены толькі ў 1996 г.)[18]. Увесь час, нават у самых складаных абставінах жыцця, не спыняў Міхаіл Сяргеевіч працы над сваёй галоўнай працай «Історія України-Руси» (выйшлі тамы 8 і 9), двойчы перавыдаў «Ілюстрованную Історію України».

[17] Армія УНР працягвала аказваць супраціўленне на Праўвабярэжжы ў надзвычай неспрыяльнай міжнароднай сітуацыі. Так, расіяне-белагвардзейцы настройвалі краіны Антанты супраць Украіны, краіны ж Германскага блоку прайгралі вайну і перажывалі рэвалюцыйныя ўзрушанні, а адноўленая ў лістападзе 1918 г. Польшча павяла вайну супраць украінцаў у Галіччыне. Паколькі Польшча была саюзнікам Антанты, то гэты блок краін схільны быў падтрымліваць польскія амбіцыі ў Заходняй Украіне. Між тым, адчайны супраціў украінцаў зрабіў сваю справу, і з ліпеня 1919 г. сітуацыя пачала выпраўляцца: пачаўся контрнаступ арміі УНР і ў жніўні 1919 г. былі вызвалены Кіеў і Адэса. 1 верасня 1919 г. было заключана перамір'е з палякамі, што спрыяла паступоваму ўрэгуляванню памежных спрэчак і спрыяла прызнанню УНР з боку краін Антанты. У красавіку 1920 г. быў заключаны польска-украінскі саюз, скіраваны супраць бальшавіцкай Расіі. У жніўні 1920 г. саюзнікі нанеслі расіянам маштабныя паразы пад Львовам і Варшавай. Але ў наступным Польшча выйшла з вайны з Савецкай Расіяй (Рыжскі мір 18 сакавіка 1921 г.) і аддзелы УНР у адзіноце вялі няроўную барацьбу да 1930-х гг.

[18] Гэтую, а таксама «Історію України-Руси» і іншыя працы М.С. Грушэўскага можна знайсці ў анлайн-версіі ці ў электроннай версіі кніг-арыгіналаў на рэсурсах: Ізборнік (http://litopys.org.ua/hrushukr/hrushe.htm) і Чытво (http://chtyvo.org.ua/authors/Hrushevskyi).

Разам з тым, у снежні 1922 г. узнік Савецкі Саюз як (de jure, але не de facto) дзяржаўны саюз многіх раўнапраўных рэспублік. У 1920-я гг. савецкі рэжым дапусціў дэмакратызацыю, што закранула эканамічную (НЭП ці «новая эканамічная палітыка») і палітычна-прававую сферы. У савецкай Украіне з'явілася магчымасць развіваць украінскую культуру і навуку. Напрыклад, у 1923 г. прафесару М.С. Грушэўскаму было нададзена званне акадэміка Украінскай АН у Кіеве. Адзначым, што такі паварот у практыцы савецкай сістэмы быў вымушаны: бальшавікі ўлічылі вопыт часоў барацьбы за ўладу і Грамадзянскай вайны ў нацыянальных рэгіёнах (паразы ў Фінляндыі, Прыбалтыцы, Закаўказзі, Польшчы, Украіне і інш.), улічылі таксама вопыт няўдач праціўнікаў з Белага руху, тэндэнцыі сучаснага ім свету, наяўную патрэбу ў дэмакратызацыі і набліжэнні да народных інтарэсаў. Усё гэта натхняла мноства вучоных і дзеячаў культуры вяртацца з эміграцыі ў СССР. У сакавіку 1924 г. вярнуўся ў Кіеў і М.С. Грушэўскі. Яго багаты навуковы і арганізацыйны досвед быў вельмі запатрабаваны ў маладой Савецкай Украіне, і Грушэўскі з галавой акунуўся ў навуковую працу. Так, вялікая была яго роля ў заснаванні і развіцці Інстутутаў гісторыі і сацыялагічных даследаванняў Акадэміі навук Украіны. У 1929 г. Грушэўскі быў абраны ў акадэмікі АН СССР. Аднак у той жа год добрыя часы скончыліся. На вучонага абрынуліся рэпрэсіі. У сакавіку 1931 г. Міхаіла Сяргеевіча арыштавалі і абвінавацілі ў арганізацыі і кіраўніцтве «Украінскім нацыяналістычным цэнтрам». Відаць, даказаць віну Грушэўскага не ўдалося, таму ён быў вызвалены пад нагляд чэкістаў. Апошнія гады пражываў у Маскве. Нападкі і следчае пераследаванне не спыняліся. У 1934 г. яму дазволілі (вядомы ў свеце прафесар амаль старціў зрок) выехаць на адпачынак у Кіславодск (на Кубаншчыне). Тут 24 лістапада 1934 г. пасля неахайна праведзенай аперацыі (ці не знарок?) М.С. Грушэўскі памёр. Рэпрэсіі абрынуліся таксама на яго жонку Марыю-Івану (урадж. Ваякоўская, 1868—1948) і адзіную дачку Кацярыну (1900—1943), што таксама была гісторыкам.

У сваіх працах Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі выклаў фундаментальныя рэчы, выключна каштоўныя для разумення гісторыі ўкраінскага і беларускага народаў. У лістападзе 1904 г. Грушэўскі выдаў артыкул прынцыповай важнасці «Звичайна схема «русскої» історії і справа раціонального укладу історії Східного Слов'янства». Тут ён крытыкаваў схему «звычайнай рускай» гісторыі як традыцыі маскоўскіх кніжнікаў і імперскай расійскай гістарыяграфіі XIX ст., што ігнаравала гістарычнае быццё ўкраінскіх і беларускіх зямель, а з Кіеўскай Русі непасрэдна выводзіла Уладзімірскае і Маскоўскае княствы XIII—XIV стст., Маскоўскую дзяржаву і Расійскую імперыю ў наступным. Грушэўскі даводзіў: «Київський період перейшов не у володимиро-московський, а в Галицко-Волинський XIII в., а потім литовсько-польський XIV—XVI вв.»[19]. «Зрештою «общеруської історії» й

[19] Грушевський, М.С. Звичайна схема «русскої» історії і справа раціонального укладу історії Східнього Слов'янства // Український історичний журнал. — 2014. — № 5. — С. 203—208.

не може бути, як нема «общеруської» народності. (...) Найбільше раціональне здається мені представлення історії кожної народності зокрема, в її генетичнім преємстві від початку аж донині. (...) треба б усунути теперішній еклектичний характер «руської історії», зшивання докупи епізодів з історії ріжних народностей»[20]. Гэтая тэндэнцыя сшывання гісторыі розных здаўна і ад пачатку народнасцяў — украінцаў, беларусаў і расіян (вялікарусаў) была вынікам падмены паняцця гісторыі «рускага народа» як гісторыі рускіх ці ўсходнеславянскіх народаў гісторыяй вялікарускага (расійскага) народа[21].

На думку М.С. Грушэўскага, відавочна слабым месцам схемы «звычайнай рускай гісторыі» былі масквацэнтрызм і адмаўленне гістарычнай пераемнасці паміж Кіеўскай Руссю і Украінай. Фактычна, перыферыйная форма гэтай старажытнай Кіеўскай Русі (Уладзімірскае і Маскоўскае княствы) прысвойвала сабе ўласна ўкраінскую (Кіеўскую і Галіцка-Валынскую) спадчыну. Таму М.С. Грушэўскі піша, што гэта нагадвае сітуацыю, калі б спадкаемнікі гала-рымлян у Францыі прысвойвалі б сабе ўсю спадчыну Старажытнага Рыма[22]. Яшчэ ў больш складаным становішчы знаходзіцца гісторыя беларускай народнасці, якая была, паводле Грушэўскага, толькі адным з актыўных (ці «творчых») складовых частак гетэрагеннага Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ). Агулам, адсылаючы да прац Устралава і Ілавайскага, Грушэўскі лічыў заканамерным асобна гаварыць аб гісторыі Заходняй Русі (ВКЛ) і Усходняй Русі (Маскоўскай дзяржавы)[23]. Прычым у сваёй працы 1904 г. ён пісаў аб тым, што беларускі і ўкраінскі народы былі ў складзе ВКЛ пераемнікамі спадчыны (права і культуры) Кіеўскай Русі[24]. Але ў далейшым, асабліва пачынаючы з 1772 г., Расійская імперыя скарысталася з бездзяржаўнага існавання беларускага і ўкраінскага народаў і навязала ім інтэрпрэтацыю гісторыі ў варыянце, выгадным вялікарускай народнасці[25].

У 1-м томе «Історії України-Руси» акрэслена этнічная тэрыторыя украінцаў (Украіны): 850 тыс. кв. км паміж 390° і 620° усходняй даўгаты, 450° і 330° паўночнай шыраты на поўнач ад Чорнага мора ў рачной сістэме Дняпра і прытокаў, а таксама прылеглых рэк Буг і Сан (на захадзе) і Данец (на ўсходзе). На гэтым абшары нават афіцыйная статыстыка Расійскай і Аўстра-Венгерскай імперый пачатку XX ст. фіксавала суцэльны масіў пражывання (звыш 80 % з 40 млн насельніцтва) украінскай народнасці[26]. Да сярэдзіны XVI ст. натуральны рух украінцаў з Сярэдняга Падняпроўя да Чорнага мора спыняўся ў стэпавай паласе ціскам «турэцкіх (цюркскіх) орд», і толькі ў

[20] Там жа. С. 207, 208.
[21] Там жа. С. 207.
[22] Там жа. С. 204.
[23] Там жа. С. 205.
[24] Там жа. С. 206.
[25] Там жа. С. 207.
[26] Грушевський, М.С. Історію України-Руси: у 11 т., 12 кн. Рeпрінт. Київ: Наукова думка, 1991. Т. 1. С. 6—7.

наступным, калі гэты ціск аслабеў, украінская народнасць разгарнулася і засяліла (асабліва актыўна ў XVIII ст.) Прычарнамор'е ажно да Каўказу[27].

Калі ж казаць аб вытоках украінскага народу, то, паводле Грушэўскага, украінская прысутнасць у акрэсленым вышэй краі брала пачатак ад часу славянскага этна-палітычнага саюзу антаў (IV—VI стст.). Ужо ў VI ст. (паводле гоцкага гісторыка Іардана і візантыйскага Пракопія) анты засялялі абшары на поўнач ад Чорнага і Азоўскага мораў[28]. Цэнтрам прыцягнення гэтых тэрыторый быў Кіеў, што існаваў з V ст. і меў ад часоў князя Кія (V—VI ст.) сваю княжаскую дынастыю. Да нарманскай канцэпцыі М.С. Грушэўскі ставіўся скептычна, і ва ўсякім выпадку лічыў, што нарманская дынастыя Рурыкавічаў (Аскольда і Дзіра ён лічыў нашчадкамі Кія) прыйшла ў Кіеў у другой палове IX ст. і наклалася ці лепш упісалася ў дзяржаўную і культурную традыцыю Кіеўскай Русі, што існавала з VI ст. Уплыў варажскіх дружын быў заўважны ў X ст., але Грушэўскі быў упэўнены, што назва «Русі» паходзіла не ад варагаў, але ад вобласці палян (Кіеўскай зямлі) і паступова пашырылася на землі, падначаленыя Кіеву[29].

Заўважым, што паводле Грушэўскага, у X ст. як вынік рассялення розных груп славянскіх плямён ва Усходняй Еўропе сфарміраваліся этнічныя межы. Напрыклад, па Прыпяці ішла мяжа рассялення украінцаў і беларусаў: на поўнач жылі беларускія плямёны дрыгавічоў і крывічаў, а на поўдзень, уключна з Піншчынай, — украінскія, нашчадкі антаў (паляне, дулебы і інш.)[30].

Калі ў выпадку Галіцка-Валынскай Русі XIII—XIV стст. (Каралеўства Малой Русі, Regni Ruthenorus, Regni Russie Mynorys) пераемнасць спадчыны Кіеўскай Русі прамая і відавочная, то для эпохі Вялікага Княства Літоўскага XIV—XVI стст. гэтая пераемнасць была важная і істотная, але апасродкаваная. Да прыкладу, М.С. Грушэўскі акрэсліваў «этнічна чужы характар» «літоўскай зверхненасці» (то бок літоўскай знаці) над заходнерускімі землямі часоў ВКЛ. Разам з тым, гэтая літоўская дамінацыя ўжо з XIV ст. мела «дужа малыя памеры», паколькі літоўская княжаская дынастыя з XIV ст. «была толькі па імені літоўская», але «ў пераважнай большасці» па веры і мове блізкай заходнерускім народам; і «слов'янська стихія (білоруська й українська) заливала литовську»[31]. Напрыклад, нормы дзяржаўнага права з дадаткам больш позніх уплываў былі ўспадкаваныя ВКЛ ад Кіеўскай і Галіцка-Валынскай Русі. Праз тое і самі вялікія літоўскія князі бачылі сябе спадкаемцамі старажытнай Рускай дзяржавы[32]. Болей за тое, Грушэўскі пі-

[27] Там жа. С. 13—14.

[28] Там жа. С. 166—167, 172, 177, 368, 372, інш.

[29] Там жа. С. 192, 374, 376—377, 379—391, інш.

[30] Там жа. С.186—187, 220. Тут жа (с.188) вяцічы акрэслены як продкі вялікаросаў, блізкія ж ім радзімічы — пераходнае племя. Паўднёвая ж група плямен (паляне, северане, драўляне, дулебы і інш.) вызначаліся як украінскія плямёны ці народнасць (с.198—209).

[31] Грушевський, М.С. Історію України-Руси: у 11 т., 12 кн. Репрінт. Київ: Наукова думка, 1993. Т.4. С. 95—97.

[32] Там жа. С. 98. Напрыклад, ужо Гедымін называў сябе «каралём Літоўскім і Рускім» або Rex Letwinorum et Rutenorum, Rex Letwinorum et multorum Rutenorum (с. 95).

ша аб «рускім характары» ВКЛ у другой палове XIV ст.[33] Апошняе, напрыклад, праявілася ў 1341—1382 гг. падчас змагання за Валынь паміж літоўскімі князямі (Кейстут, Любарт і інш.) і Польшчай (у саюзе з Венгрыяй), калі літоўскія князі знаходзілі падрымку мясцовага насельніцтва Валыні[34].

Разам з тым, увогуле перыяд XIV—XVI стст. у гісторыі украінскага (і беларускага) народаў Міхаіл Сяргеевіч лічыў часам упадку, калі назіраўся працэс занявольвання ўкраінскага народу палякамі, пераўтварэнне украінцаў у «народность служебну, підданську, експльоатовану». Гэтую з'яву Грушэўскі характарызаваў як «фатальную»; пісаў, што моцнае апазіцыі гэтаму працэсу не было. І толькі з канца XVI ст. пад уплывам рэлігійна-нацыянальнай сітуацыі пачынаецца украінскі рух, апорай якога сталі казакі, якія пачалі рэпрэзентаваць не класавыя, а агульнанацыянальныя інтарэсы[35].

Трэба сказаць, што М.С. Грушэўскі вялікую ўвагу надаваў працэсу страты ВКЛ «рускага характару» (у сэнсе украінска-рускага) і пашырэнне ў гэтай краіне польскага ўплыву, што тлумачалася ім як вынік уніі 1385 г. (Крэўскай) між Літвой (Літвой-Руссю) і Польшчай (сярод умоў уніі, што былі прынятыя вялікім князем Ягайлам, быў абавязак «навечна прылучыць сваі землі, літоўскія і рускія, да Кароны Польскай»)[36]. Спробы вялікага літоўскага князя-намесніка Вітаўта спыніць унію з Польшчай не ўдаліся з-за паразы ў бітве на Ворскле 1399 г. (загінуў цвет руска-літоўскага рыцарства) і праз няўдачу з праектам каранацыі Вітаўта ў 1430 г. Разам з тым, Грушэўскі даводзіў, што ВКЛ было ўнутрана вельмі крохкае праз вялікую самастойнасць асобных князёў дынастыі Гедымінавічаў у сваіх княствах-валасцях, таму унія з Польшчай і апора на польскія сілы ў абставінах таго часу (разлад сярод Гедымінавічаў па смерці Альгерда ў 1377 г.) ратавалі аўтарытэт вялікага князя літоўскага[37]. І з гэтага скарыстаўся не толькі Ягайла, але і Вітаўт, што з 90-х гг. XIV ст. праводзіць палітыку цэнтралізацыі, паступовага абмежавання і ліквідацыі мясцовых княстваў[38]. Да таго ж, паводле Грушэўскага, паміж літоўскім і рускім элементам у ВКЛ з 1385 г. быў убіты клін (хрышчэнне Літвы па-каталіцку і наданне каталікам-літвінам асаблівых прывілеяў), што з часам пранікаў усё больш глыбока і аслабляў энергію супрацiву эліт далучэнню да Польшчы, а самое гістарычнае існаванне ВКЛ пераходзіла ў стадыю «агоніі»[39]. З іншага боку адавочна, што для перыяду канца XV — XVI стст. М.С. Грушэўскі надае адносна малое значэнне маштабнай экспансіі Маскоўскай дзяржавы на землі ВКЛ, што адначасова аслаблялі Літоўскую Русь, раздзялялі яе знутры і вымушалі шукаць дзяржаўнага саюзу з Польшчай. Так, з аднага боку, Міхаіл Сяргеевіч піша аб вымушанай цеснай уніі паміж Літвой і Польшчай 1501 г. (Карона і

[33] Там жа. С. 99.

[34] Там жа. С. 57—59. Але Галічына, уразрэз яе іміджа, ахвотна прыняла польскую ўладу.

[35] Там жа. С. 4.

[36] Там жа. С. 99, 125—131, 136—137, 140, 145, 150—151, 157, 159—160, 180—184, інш.

[37] Там жа. С. 143, 147, 157, 159, 184.

[38] Там жа. С. 167, 174.

[39] Там жа. С. 181—184, 204.

Княства злучаліся ў адно непадзельнае цела, адзін народ з адным каралём) — як вынік пошуку ўзаемнай падтрымкі ў барацьбе з маскоўскай агрэсіяй для адных і турэцка-татарскай для другіх. З ішага боку, тут жа ён спрабуе паказаць фіктыўнасць дамовы[40], што выглядае больш чым сумніўна.

На жаль, інтэрпрэтацыя Міхаілам Сяргеевічам перыяду існавання ВКЛ у XV—XVI стст. праведзена (тамы 4, 5, 6 яго «Історії України-Руси») праз прызму акрэсленай вышэй «агоніі», «фатальнага спольшчвання». Пры слушнасці мноства назіранняў і аргументаў украінскага даследчыка, нельга, напэўна, пагадзіцца з ацэнкай падзей выключна ў плоскасці фатальнасці гістарычнах працэсаў. Зразумела, што многія з'явы былі заканамерным вынікам кантактаў культур і сацыяльнага развіцця, мелі аб'ектыўны характар. Так, паводле таго ж Грушэўскага, цесныя сувязі звязвалі Галіцкую і Валынскую землі з Венгрыяй, Польшчай, Германіяй, Чэхій; і гэта ўвасаблялася ў праектах і спробах рэалізацыі царкоўнай уніі яшчэ ў XIII ст., пашырэнні ў краіне «нямецкіх парадкаў» у першай палове XIV ст.[41]

Вялікую ўвагу ў сваёй працы «Історія України-Руси» Міхаіл Сяргеевіч надае працэсам барацьбы знаці ВКЛ за самастойнасць свайго княства ад Польшчы («фронда літоўскіх аўтанамістаў», пагрозы літоўскіх паноў у 1463 г. пачаць вайну з Польшчай з-за яе прэтэнзій на Валынь ці патрабаванні ў 1461 г. Казіміру IV прызнаць Сямёна Алелькавіча вялікім літоўскім князем)[42]. Вялікае значэнне прыдзяляў ён таксама працэсам пашырэння магдэбурскага, ці «хелмінскага» права, што ацэньвалася ім таксама адмоўна як праява паланізацыі. Адмоўнымі бачыліся яму і працэсы пашырэння шляхецкага права па польскім узоры. Так, шляхта, паводле Грушэўскага, абрала прывілеі і ўзбагачэнне за кошт запрыгоньвання сялян, і таму праз адчужэнне ад дэмакратычнага элемента (сяляне, мяшчане, казакі) пасіўна сустракала паланізацыю і паддавалася ёй[43]. З гэтага вынікала, што рухаючай сілай украінскага нацыянальнага адраджэння ў XVII ст. магло стаць менавіта казацтва — галоўны аб'ект працы Грушэўскага.

Заўважым, што празмерна супярэчлівай выглядае спроба М.С. Грушэўскага трактаваць салідарную фронду літоўскіх і рускіх паноў 1460-х гг. (што былі ўраўняныя ў правах ужо ў 1432 г.) як «выпадковую палітычную камбінацыю», а не праяву «нацыянальнай гармоніі»[44]. Па ўсім бачна, што для перыяду XV—XVI стст. ён перабольшваў значэнне расколу сярод феадалаў Літоўска-Рускай дзяржавы па лініі літовец-каталік і рускі-артадокс. Гэта вынік яго нягібкай канцэпцыі агоніі ВКЛ пасля 1385 г. Асабліва відавочна гэта пры разглядзе ім няўдалага паўстання М. Глінскага 1508 г. як «апошняй спробы барацьбы рускага элементу супраць варожай яму сістэмы

[40] Там жа. С. 261—262, 268, 279.

[41] Грушевський, М.С. Історію України-Руси: у 11 т., 12 кн. Рэпрінт. Київ: Наукова думка, 1993. Т. 3. С. 50, 70—76, 95, 113—114, 122, 128—130, 134.

[42] Грушевський, М.С. Історію України-Руси: у 11 т., 12 кн. Рэпрінт. Київ: Наукова думка, 1993. Т. 4. С. 249, 251.

[43] Там жа. С. 292. Грушевський, М.С. Історію України-Руси: у 11 т., 12 кн. Рэпрінт. Київ: Наукова думка, 1994. Т. 5. С. 50—51, 67, 175, 202, 220, 228.

[44] Там жа. С. 266.

ВКЛ»; пры тым, што Глінскі знайшоў патрымку ў знешніх сіл (Масквы), а не рускай шляхты і баяр краіны, да якіх адрасаваў сваі заклікі[45].

Важна сказаць, што Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі зрабіў вялікі ўклад у развіццё ўкраінскай гістарыяграфіі. Яго працы ўвялі у навуковы зварот вялікую колькасць гістарычных крыніц, фактычнага матэрыялу. Асабліва каштоўныя яго падрабязныя звесткі аб перыядзе XIV—XVI стст., што дагэтуль менш вывучаныя за папярэднія і наступныя часы ў гісторыі як украінскага, так і беларускага народаў. Можна пабачыць, як яго прыхільнасць да ўкраінскіх народніцкіх і сацыялістычных поглядаў адлюстравана ў яго працах у выкладзе матэрыялу і ацэнках гістарычных працэсаў. Як вынік узнікае ўражанне, нібыта казацтва Украіны адасабляецца ад украіна-рускай шляхты, супрацьпастаўляецца ёй. У той жа час вядома, што вялікая колькасць шараговых казакоў і казацкай старшыны паходзіла са шляхты. Дастаткова тут прыгадаць хаця б Піліпа Орліка, Івана Выгоўскага, Івана Мазэпу, нават самаго Багдана Хмяльніцкага. Разам з тым, у сваіх працах Грушэўскі перабольшвае «польскі характар» працэсаў развіцця «залатых» шляхецкіх вольнасцей, магдэбургскага права, Берасцейскай уніі 1596 г. і яе наступстваў.

Увогуле, працы Грушэўскага дазваляюць пабачыць падабенства гістарычных працэсаў на ўкраінскіх і беларускіх землях ВКЛ са з'явамі ў суседніх краінах Цэнтральнай Еўропы (Польшча, Венгрыя, Германія). Можна заўважыць, што прынамсі з сярэдзіны XIII ст. Галіцка-Валынская Русь больш звязаная і задзейнічаная ў справах сваіх заходніх суседзяў, чым у справах ва Усходняй Еўропе. Па сутнасці, М.С. Грушэўскім былі шырока асветленыя (хоць і з крытычнай ацэнкай) працэсы пашырэння рыцарскага і гарадскога права на ўзор Германіі і Польшчы, з'яўленне ва ўкраінскіх землях масы каланістаў, пашырэнне рыцарскай і бюргерскай культуры з XIV ст. (у часы Баляслава-Юрыя II у Галіцка-Валынскай кароне), царкоўная унія 1596 г., змест адукацыі і літаратуры. Усё тое паказвае аб'ектыўныя працэсы інтэграцыі ўкраіна-беларускіх зямель з XIV—XV стст. у Еўрапейскі свет.

Як вынік, знаходзім у Грушэўскага падцвярджэнне думкі сучасных беларускіх гісторыкаў пра далучэнне зямель і народаў ВКЛ у XIV—XVIII стст. да Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Вынікам гэтых працэсаў стала фарміраванне самабытных украінскай і беларускай (таксама літоўскай) нацыянальных культур і моў на абшарах ВКЛ[46]. Працяглы перыяд узаемадзеяння і трываласць гістарычных з'яў сведчылі аб пераўтварэнні гістарычнай Украіны і Беларусі ў Новую Сярэднюю Еўропу. Цікава, што з часоў караля Данілы Галіцкага, затым вялікага літоўскага князя Вітаўта і Аляксандра Ягелончыка гэтыя землі знайшлі сваю гістарычную місію ў ролі бастыёна Еўропы на Ўсходзе, што абараняе Еўрапейскі свет ад націску варвараў-разбуральнікаў з усходу, але адначасова служыць мастом на Дзікі Усход, у Еўразію.

[45] Там жа. С. 281, 288, 291.

[46] Кравцевич, А.К. [и др.]. Белоруссы: нация Пограничья. Вильнюс: ЕГУ, 2011. С. 47—53, 61, 63, 66, 208.